*Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 20 (206)
Чацвер 28 кастрычніка 1954 г.

Цана 20 кап.

Камсамольскі актывіст! Тваё кіраўніцтва выходзіць з уліку пажаданняў і запытанняў мас. Ты павінен правесці ў жыццё гэтыя запытанні і пажаданні, правільна накіраваўшы актыўнасць радавых камсамольцаў.

Толькі еднасць з калектывам пазбавіць цябе ад цяжкіх памылак.

## ЗА ЗМЯСТОЎНУЮ КОМСАМОЛЬСКУЮ РАБОТУ

Справаздачна-выбарчыя комсамольскія сходы, VIII агульна-універсітэцкая канферэнцыя прайшлі пад знакам дзелавой і прынцыповай крытыкі і самакрытыкі. Комсамольцы абмеркавалі ўсе бакі свайго шматграннага жыцця, выказалі думкі аб тым, што хвалюе іх і цікавіць.

Суровай і справядлівай крытыцы падверглася на сходах дзейнасць комсамольскіх бюро біёлага-глебавага, геолага-геаграфічнага і гістарычнага факультэтаў. Члены гэтых бюро мала ўвагі ўдзялялі вучобе комсамольцаў, праходзілі міма фактаў парушэння асобнымі комсамольцамі правіл соцыялістычнага супольнага жыцця. На курсах і факультэтах рэдка праводзіліся захапляючыя мерапрыемствы, амаль не было цікавых вечароў, добрых лекцый і дакладаў. Не дзіўна, што з поля зроку комсамольскага бюро біёлага-глебавага факультэта выпалі паводзіны студэнтаў Галадушка, Савіцкага і Самусенка, якія п'янымі з'явіліся на спаборніцтвы па валейболу. Калі ім была зроблена заўвага, гэтыя комсамольцы наогул пачалі адмаўляцца ад удзелу ў спаборніцтвах. Мала ўвагі выхаванню моладзі ўдзяляла і комсамольскае бюро геолага-геаграфічнага факультэта. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што комсамольцы II курса аддзялення геалогіі Осіпаў, Жукаборскі, Тагуноў, Сядлецкі, Рысявец і Лупіновіч у час працы ў калгасе спрабавалі супроцьпаставіць сябе калектыву.

Аналагічныя выпадкі былі і сярод студэнтаў другіх факультэтаў. Колькі разоў разбіраліся на комсамольскіх сходах паводзіны студэнта IV курса аддзялення журналістыкі Нікіфарава, які ў гэтым годзе ў трэці раз адмовіўся ехаць у калгас! Але далей размоў справы не пайшлі.

Комсамольскае даручэнне яшчэ не стала ў нас сродкам праверкі маральных і дзелавых якасцей кожнага члена ВЛКСМ. Даручэнняў давалася многа, а праверыць іх выкананне не здагадваўся ні адзін з комсамольскіх важакоў. Мала хвалявала, напрыклад, членаў бюро біёлага-глебавага факультэта тое, што з 60 даручэнняў, дадзеных імі ў час зімовых канікул, былі выкананы толькі адзінкі.

Уноў абраныя комсамольскія бюро факультэтаў і курсаў распачынаюць сваю дзейнасць. Пры складанні планаў работы яны ўлічваюць заўвагі і пажаданні, выказаныя на справаздачна-выбарчых сходах.

Галоўны абавязак комсамольца—авалодваць ведамі, паўсядзённа павышаць свой палітычны і культурны ўзровень. Гэтаму неабходна ўдзяліць асноўную ўвагу пры планаванні комсамольскай работы. Сярод мерапрыемстваў, якія намячаецца правесці, патрэбна выдзеліць тыя, што садзейнічаюць фармаванню комуністычнай свядомасці, што спрыяюць выпрацоўцы якасцей, неабходных маладому спецыялісту ў яго будучай рабоце.

Комсамольскаму калектыву універсітэта патрэбна не адміністраванне, а канкрэтнае кіраўніцтва, заснаванае на веданні запросаў і пажаданняў мас. Сіла важака моладзі—у яго сувязях з комсамольцамі, ва ўменні выявіць і накіраваць іх актыўнасць. Толькі гэта дапаможа актывісту зрабіць комсамольскую работу цікавай і змястоўнай, дапаможа яму пазбегнуць многіх памылак.

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ



*19 кастрычніка аспірант кафедры гісторыі СССР І. В. Міронаў абараніў дысертацыю на тэму: „Уздым матэрыяльнага добрабыту працоўных БССР у пасляваенныя гады (1944—1953)“.*

*І. В. Міронаву прысуджана навуковая ступень кандыдата гістарычных навук.*

### У гуртку журналістыкі

Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне гуртка журналістыкі. На ім прысутнічала звыш сарака студэнтаў.

Навуковыя кіраўнікі гуртка дацэнт М. С. Зярніцкі і кандыдат філалагічных навук М. Е. Цікоцкі пазнаёмілі першакурснікаў з задачамі гуртка, з яго работай, расказалі аб выніках гарадскога агляду студэнцкіх навуковых работ.

Заняткі ў гуртку даюць студэнтам вопыт і навыкі, якія неабходны для напісання курсавых і дыпломных работ.

Гурткоўцы абмеркавалі план сваёй работы на бягучы год. Сярод тэм, якія будуць імі распрацоўвацца,—«Гісторыя беларускай журналістыкі», «Нарысы ў беларускай журналістыцы» і іншыя. Прадугледжаны сустрэчы студэнтаў з рэдактарамі рэспубліканскіх газет, супрацоўнікамі часопіса «Маладосць».

**С. КУЦ,**
**Г. ІВАНОВА.**



*На стралковых спаборніцтвах сярод каманд вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска студэнтка IV курса фізіка-матэматычнага факультэта І. Загорская выбіла 558 ачкоў з 600 магчымых і выканала норму майстра спорту. Яна заваявала першае месца сярод жанчын горада.*



□

Пасля сеанса адначасовай гульні ў шахматы на 23 дошках са студэнтамі універсітэта І. Е. Балеслаўскі сказаў:

«У трэці раз я сустракаюся са студэнтамі вашага універсітэта і кожны раз адчуваю ўсё ўзрастаючае майстэрства універсітэцкіх шахматыстаў.

Ад усёй душы жадаю шахматыстам новых поспехаў у вучобе і на шахматнай дошцы».

**Фото А. КАСЦЮЧЭНКІ.**

□

## ВЕСТКІ З КУРСАЎ

### ДОБРАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Рэгулярна наведваюць лекцыі студэнты другога курса аддзялення біялогіі. Тут не было яшчэ ні аднаго выпадку пропуску заняткаў без уважлівых прычын. Акуратна рыхтуюцца да практычных заняткаў і сістэматычна наведваюць іх Вера Аляхновіч, Тамара Бялявіна і Галіна Курапаценка. Асаблівым поспехам на курсе карыстаюцца лекцыі дацэнта Бабраўніцкага па арганічнай хіміі і дацэнта Сержаніна па заалогіі хрыбетных.

Э. ГНЕДЗІНА.

### У ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Паспяхова праходзяць практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу на першым курсе аддзялення матэматыкі. Студэнткі Бэла Дрызіна і Ірына Бахоўчык рэгулярна рыхтуюцца да іх і заўседы даюць грунтоўныя адказы на пытанні кіраўнікоў Родава і Стадольніка.

### ЗАНЯТКІ ПРАХОДЗЯЦЬ ЦІКАВА

Студэнтам нашай групы прыходзіцца адначасова вывучаць тры новых мовы: нямецкую, балгарскую і лацінскую. Гэта стварае значныя цяжкасці. Але пераадольваць іх нам дапамагае тое, што выкладчыкі імкнуцца нас зацікавіць сваім прадметам. Жыва праходзяць заняткі па нямецкай мове. Побач з перакладам тэкстаў і выкананнем практыкаванняў выкладчык тав. Цыганкова часта арганізуе граматычныя віктарыны і гульні. Яны даюць нам магчымасць замацаваць правілы і папоўніць слоўнікавы запас. На апошніх занятках мы такім чынам паўтарылі раздзел аб галоўных і даданых сказах. У нашай групе, у склад якой уваходзяць студэнты другіх курсаў рускага і беларускага аддзяленняў, не бывае дрэнных адзнак па нямецкай мове. Міхаіл Томка, Ефрасіння Сяляўка і Міхаіл Канапліцкі адказваюць толькі на выдатна.

Т. ХОМІЧ.

### АФАРМЛЯЮЦЬ ВЫНІКІ ПРАКТЫКІ

Цікава правялі лета студэнты трэцяга курса аддзялення біялогіі. Яны пабывалі ў раёне возера Нарач. Тут паўтара месяца працягвалася іх практыка. Мэтай яе было вывучэнне жывёльнага свету. Студэнты пазнаёміліся з жыццём птушак і паўзуноў у прыродных умовах, сачылі за прывычкамі розных лясных птушак, запісвалі, дзе і як яны гняздуюцца.

—Практыка была вельмі карыснай,—расказвае староста курса Башэева.—Кожны з нас запісваў назіранні ва ўласныя дзённікі. Цяпер мы заканчваем афармленне вынікаў практыкі. Справаздачы большасці студэнтаў атрымалі высокую ацэнку кіраўніка т. Гальцовай.

## СПАРТЫЎНАЙ ЗІМЕ ПАДРЫХТАВАНУЮ СУСТРЭЧУ

У мінулым годзе сярод студэнтаў, якія наведвалі секцыю лыжнага спорту, вучэбна-трэніровачная работа вялася на вельмі нізкім узроўні. Сведчаннем гэтага з'явіліся вынікі першынства горада сярод вышэйшых навучальных устаноў, у якіх зборная каманда універсітэта заняла перадапошняе, 7-ае месца. Такім вынікам спрыяла дрэнна падрыхтаваная лыжная база, якая амаль не палепшылася і ў гэтым годзе. З 170 пар лыж, якія маюцца на лыжнай базе, няма ніводнай пары, якая-б была добра падрыхтавана да спаборніцтваў. У практыцы мінулых гадоў можна было назіраць, што часта на адказных спаборніцтвах нашы спартсмены не маглі паказаць добрых вынікаў па прычыне непадрыхтаванасці інвентару.

У мінулым годзе ў лыжнай секцыі не было патрэбнай спартыўнай дысцыпліны. Нярэдка асобныя лыжнікі прапускалі заняткі, што потым адмоўна адбівалася на выніках спаборніцтваў. Так, Стражэвіч і Хаткевіч мелі магчымасць дабіцца другога разраду, але ў выніку нядбайных адносін да трэніровак яны ўкладаліся толькі ў трэці разрад. Бываюць выпадкі, калі здольныя разраднікі без усялякіх прычын перастаюць наведваць трэніроўкі. Здаралася гэта таму, што кафедра фізічнага выхавання і спорту і нізавы Совет ДСТ «Навука» не кантралявалі штодзённа работу секцыі.

Для далейшага развіцця лыжнага спорту ва універсітэце комсамольскім бюро факультэтаў і нізавому Совету ДСТ «Навука» патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу на стварэнне факультэцкіх лыжных секцый. У мінулым годзе яны існавалі толькі на асобных факультэтах і працавалі крайне не сістэматычна. Для кіраўніцтва гэтымі секцыямі павінны быць вылучаны грамадскія інструктары або трэнеры з ліку студэнтаў, якія ўваходзяць у зборную каманду універсітэта. Пры кафедры фізічнага выхавання дзеля гэтага трэба праводзіць з удзельнікамі зборнай каманды універсітэта семінары, якія-б ставілі сваёй мэтай падрыхтоўку грамадскіх інструктараў па лыжнаму спорту. Важным фактарам развіцця лыжнага спорту ва універсітэце з'яўляецца выкананне студэнтамі першых і другіх курсаў нарматываў ГПА I і II ступені.

Сур'ёзнае хваляванне выклікаюць горналыжнікі. У мінулым годзе не працавала секцыя па гэтаму віду спорту. У спаборніцтвах прыходзілася выступаць зусім непадрыхтаваным спартсменам. Становішча не змянілася і цяпер. 5 пар слаломных і 2 пары скачковых лыж ніяк не могуць задаволіць планамерную і пастаянную работу секцыі горналыжнага спорту.

Не прыступілі яшчэ да трэніровак і хакеісты. Такое становішча, як бачна, не хвалюе кафедру фізічнага выхавання і спорту.

# УЛІЧЫЦЬ ПАЖАДАННІ КОМСАМОЛЬЦАЎ УНІВЕРСІТЭТА,

★

## Больш увагі самастойнай рабоце

(З выступлення ГАНЧАРЭНКІ)

Агульнавядома, што глыбокія і трывалыя веды набываюцца толькі ў працэсе самастойнай работы над кнігай. Але аб гэтым забываў наш комсамольскі камітэт, забывалі аб гэтым і ў рэктарацe. На працягу навучальнага года ніхто не пацікавіўся, ці ёсць у студэнтаў умовы працаваць самастойна. І толькі напярэдадні экзаменацыйнай сесіі ў камітэце комсамола ўспаміналі аб гэтым важным пытанні. Тэрмінова праводзіліся розныя нарады і пасяджэнні, якія толькі адрывалі студэнтаў ад вучэбы ў самы напружаны момант. Толькі няўвагай нашых грамадскіх арганізацый да пытанняў самастойнай працы тлумачыцца тое, што многія студэнты нашага аддзялення атрымалі дрэнныя адзнакі ў летнюю экзаменацыйную сесію.

Не змянілася становішча і ў гэтым навучальным годзе. Студэнты малодшых курсаў усё яшчэ маюць больш 36 гадзін лекцый у тыдзень. Нашы грамадскія арганізацыі не звяртаюць на гэта ўвагі. Так, першакурснікі аддзялення фізікі займаюцца па 48 гадзін. А калі ўлічыць падрыхтоўку да чарговых семінараў і лабараторныя заняткі, атрымліваецца, што першакурснікі вымушаны штодзённа працаваць па 15—16 гадзін. Хіба магчыма ў такіх умовах рэгулярная самастойная работа над кнігай? Безумоўна не. А разгрузіць студэнтаў магчымасці ёсць. Многія лекцыйныя курсы можна скараціць або зусім адмяніць. Напрыклад, на трэцім курсе аддзялення фізікі чытаецца курс па тэхніцы бяспекі, які не мае ніякага дачынення да нашай будучай прафесіі, бо наўрад ці прыдзецца фізікам працаваць на вугальных складах і нафтавых базах.

★ ★ ★

## З VIII агульнаўніверсітэцкай комсамольскай канферэнцыі

*24 кастрычніка адбылася VIII агульнаўніверсітэцкая комсамольская канферэнцыя. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэта комсамола тав. Ракаў. У спрэчках выступіла 13 дэлегатаў. Яны ўскрылі недахопы ў рабоце камітэта комсамола і ўнеслі рад каштоўных прапаноў. Канферэнцыя прызнала работу камітэта здавальняючай і прыняла разгорнутае рашэнне, накіраванае на паляпшэнне работы комсамольскай арганізацыі універсітэта. Абраны новы склад камітэта комсамола ў колькасці 15 чалавек.*

★

## *З даклада А. РАКАВА*

Комсамольская арганізацыя універсітэта—вялікі згуртаваны калектыў. Разам з юрыдычным факультэтам у ім налічваецца 3296 комсамольцаў. Галоўнай задачай у рабоце гэтага калектыву з'яўляецца настойлівая барацьба за глыбокія і трывалыя веды студэнтаў.

Пераважаючая большасць студэнтаў сур'ёзна і добрасумленна адносіцца да заняткаў. Толькі нязначная частка комсамольцаў атрымала ў час сесіі нездавальняючыя і пасрэдныя адзнакі. У справаздачным годзе універсітэт закончылі 310 чалавек, 66 з іх атрымалі дыплом з адзнакай.

Ва ўсім гэтым ёсць, бясспрэчна, заслуга комсамольскай арганізацыі. Пытанні вучобы студэнцкай моладзі часта з'яўляліся прадметам абмеркавання на пасяджэннях камітэта комсамола, факультэцкіх бюро і ў комсамольскіх групах.

У справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў вялікую ролю адыгрывае вытворчая практыка студэнтаў, якая вучыць прымяняць у жыцці веды, набытыя ва універсітэце. Практыка дала шмат каштоўных навыкаў студэнтам. Напрыклад, студэнты былога трэцяга курса гістфака прынялі ўдзел у археалагічных раскопках старажытняга Мінска, знайшлі багата розных рэчаў, якія адносяцца да VI—IX стагоддзяў. Цікава правялі практыку студэнты геолага-геаграфічнага факультэта, фізмата, хімфака. Студэнты добрасумленна аднесліся да практыкі, і яна прынесла ім многа новага і цікавага. Праўда, рэктарат не ўсюды арганізаваў задавальняючыя ўмовы для правядзення практыкі. Дрэнна была арганізавана практыка нашых студэнтаў у Калушы на заводзе калійных угнаенняў.

Многія комсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў навукова-даследчай рабоце. Гурткі СНТ заслухалі 398 навуковых дакладаў. Большасць з іх прадстаўляе арыгінальныя тэарэтычныя або эксперыментальныя даследаванні і мае бясспрэчную навуковую цікавасць. Гэта работы Арлоўскага, Жбанкова, Бяляцкай і другіх. Лепшай секцыяй СНТ была секцыя біялагічных навук. Асабліва добра ў ёй працавалі гурткі гідрабіялогіі і энтамалогіі. Да ліку лепшых адносяцца гурткі дыялектычнага матэрыялізма, рускай філасофіі, замежнай літаратуры і інш.

СНТ арганізавала рад навуковых канферэнцый, якія прысвячаліся 50-годдзю КПСС, 30-годдзю з дня смерці В. І. Леніна, рашэнням вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, юбілеям Л. Талстога і Бутлерава. Члены СНТ выступалі перад працаўнікамі горада Мінска і падшэфнага раёна з чытаннем лекцый на прыродазнаўчыя тэмы. У школе, дзіцячым доме, Палацы піянераў іх сіламі было арганізавана адзінаццаць гурткоў.

Значную работу на чыгуначным вузле, аўтазаводзе, на фабрыцы імя Э. Тэльмана і Фаніпальскай МТС правялі 120 студэнтаў-агітатараў. Лепшыя з іх Марыніч, Сушкевіч, Пашкоўская, Якушаў і многія другія карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам сярод сваіх слухачоў. Перад рабочымі выступала студэнтка нашага універсітэта М. Заслонава, дачка Героя Совецкага Саюза.

Важнейшае месца ў агітацыйна-масавай рабоце займалі лекцыі і даклады па пытаннях унутранага і міжнароднага жыцця, навукі, тэхнікі, культуры, якія праводзіліся ва універсітэце на факультэтах, у групах. Наладжваліся сустрэчы студэнтаў са знатнымі людзьмі краіны, з пісьменнікамі. Перад студэнтамі выступалі архітэктары Мінска, лепшыя артысты рэспублікі. Неаднаразова выступала дэлегат на Генеральнай Асамблеі ад Беларускай ССР Ф. Новікава.

Вялікую цікавасць у студэнтаў усіх факультэтаў выклікалі дзве лекцыі прафесара Н. В. Турбіна на біялагічныя тэмы. Гэтыя лекцыі паказалі, што ў студэнтаў універсітэта гарачае імкненне да ведаў, прага да жывой творчай думкі. Такія лекцыі, дзе-б у дыскусіі прымалі ўдзел і студэнты, трэба арганізоўваць і ў далейшым.

Аднак у рабоце камітэта ЛКСМБ універсітэта яшчэ шмат недахопаў. Усё яшчэ мала аказваў ён канкрэтнай, практычнай дапамогі комсамольскім бюро і комсоргам груп. Камітэт комсамола не наладзіў патрэбнага кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў. Галоўным недахопам у рабоце з'явілася адсутнасць згуртаванасці, зладжанасці і адзінства ў самім камітэце.

★

## Выкладчык павінен быць выхаваўцай

(З выступлення ГЕРУСА)

Нашы выкладчыкі павінны цікавіцца жыццём комсамольскіх груп, прысутнічаць на комсамольскіх сходах, а не абмяжоўвацца толькі чытаннем лекцый. Аднак большасць выкладчыкаў не вядзе ніякай выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Так, на аддзяленні фізікі лекцыі па асновах марксізма-ленінізма чытае тав. Маханёк. Яго зусім не хвалюе становішча ў групах. На сваіх сухіх павярхоўных лекцыях ён дазваляе студэнтам займацца пабочнымі справамі. Тое-ж самае можна сказаць аб выкладчыку Крыўчык, якая чытала лекцыі па старaславянскай мове на першым курсе аддзялення журналістыкі. Часамі выкладчыкі своеасабліва рэагуюць на парушэнні дысцыпліны на лекцыях. Яны не прымаюць канкрэтных, тэрміновых мер, а толькі пагражаюць дрэннымі адзнакамі на экзаменах. Напрыклад, выкладчыца замежнай мовы тав. Хурсік аднойчы ўжо своеасабліва рэагавала на нізкую дысцыпліну на сучасным трэцім курсе аддзялення геалогіі. З 15 студэнтаў толькі сем паспяхова здалі экзамен. Значыць, або тав. Хурсік свядома заніжала адзнакі, або яна не змагла дапамагчы студэнтам набыць веды.

Адсутнасцю належнай выхаваўчай работы сярод студэнтаў тлумачыцца той факт, што некаторыя выпускнікі адмаўляюцца ехаць працаваць у аддалёныя раёны. Доўга не згаджаўся паехаць у Давід-Гарадок выпускнік аддзялення гісторыі Кальчэўскі. Не паехала ў Маладзечанскую вобласць тав. Рытэнбанд, якая закончыла хімічны факультэт. Па пратэкцыі засталіся ў Мінску тт. Раманоўская і Шэўчык (гістарычны факультэт).

Новы склад камітэта комсамола павінен дабіцца, каб за кожным курсам быў замацаван адзін з выкладчыкаў, на якога-б ускладаўся абавязак весці сярод студэнтаў выхаваўчую работу.

## КАМІТЭТ ПРАЦАВАЎ БЕЗ АГАНЬКУ

Пасля справаздачнага даклада сакратара комсамольскай арганізацыі універсітэта т. Ракава разгарнуліся гарачыя спрэчкі. Выступаючыя справядліва крытыкавалі членаў камітэта за тое, што яны мала аказвалі практычнай дапамогі комсамольскім групам, бывалі на курсах толькі ў час справаздачна-выбарчых сходаў альбо калі ў групе здаралася што-небудзь незвычайнае.

Член камітэта т. Герасіменка, які адказваў за арганізацыйна-масавую работу, выступаў крытычна. Камітэт, па яго прызнанню, працаваў слаба, без ініцыятывы. Арганізацыйная работа была пастаўлена нездавальняюча. Членаў не папярэджвалі аб тым, якія пытанні будуць ставіцца на пасяджэннях камітэта. Апошнія, вядома, не маглі падрыхтавацца і зрабіць змястоўныя выступленні. На павестку дня ставілася, як правіла, па 5—6 пытанняў, і пасяджэнні зацягваліся часам да 12 гадзін ночы.

— А потым сядзім,—гаворыць т. Герасіменка,—і ламаем галаву гадзіны дзве, якую рэзалюцыю прыдумаць. Вядома, што сакратары факультэцкіх бюро мала бралі карыснага з такіх пасяджэнняў, рашэнняў, рэзалюцый.

Вялікім прабелам ў рабоце камітэта комсамола з'яўляецца спартыўна-масавая і абаронная работа, за якую адказвалі людзі, не маючыя нічога агульнага са спортам.

Дэлегаты тт. Марчанка і Сокалаў рэзка крытыкавалі адказную за спартыўна-масавую работу тав. Лубеннікаву, якая самавольна ўхілілася ад работы, не ўдарыла палец аб палец, каб зрабіць што-небудзь карыснае ў гэтым кірунку. І калі аднойчы ставілася пытанне аб спартыўнай рабоце на хімічным факультэце, тав. Лубеннікава прыбегла да сакратара бюро хімфака:

— Скажы мне, Майка, хоць што-небудзь аб фізкультурнай рабоце, ну хоць два-тры словы.

— Што гэта табе так прыспічыла? Ніколі не цікавішся спортам а тут раптам аж гарыш?

— Вось-вось пасяджэнне камітэта... Стаіць пытанне.., а я не ў курсе справы.

Такі стыль работы Лубеннікавай—прыбегчы, даведацца, паведаміць.

А што зрабіў за год тав. Гадун, адказны за абаронную работу? На гэтае пытанне ён і сам бадай што не зможа адказаць. Ці ведае яго хто-небудзь з старшыняў ДТСААФ факультэтаў? Наўрад ці ведаюць. Кожны з іх са здзіўленнем паглядзіць у вочы тав. Гадуну і скажа: «Не, браток, не бачыў я цябе цэлы год, не ведаў нават, што існуе Гадун ва універсітэце».

А кіраўнікам арганізацыі ДТСААФ, асабліва маладым, яшчэ не вопытным, патрэбна было дапамагчы ў многім: і ў правядзенні стралковых спаборніцтваў, і ў рабоце гурткоў, і ў зборы членскіх узносаў. Справа ў тым, што камітэт комсамола быў не патрабавальным да тт. Гадун і Лубеннікавай, не кантраляваў іх дзейнасці і наогул мала цікавіўся пытаннямі абароннай і спартыўнай работы.

Узяць хаця-б такі прыклад. Нядаўна адбыўся агульнаўніверсітэцкі крос. У ім ўдзельнічала звыш тысячы студэнтаў. Прышлі «пабалець» за сваіх сяброў нават тыя, хто не мог удзельнічаць у ім. Толькі не было відаць нікога з членаў камітэта комсамола.

За ўвесь год камітэт ні разу не ставіў на абмеркаванне пытанні фізкультурна-масавай работы. Праўда, аднойчы намячалася паслухаць старшыню ДСТ «Навука» Б. Сокалава, але потым гэтае пытанне, як адзначыў сам Сокалаў, «згарнулі». І таму не прыходзіцца здзіўляцца, што лыжнікі універсітэта занялі на спаборніцтвах ВНУ Мінска сёмае месца.

Слабым месцам у рабоце камітэта з'яўляецца культурна-масавая і палітыка-выхаваўчая работа. Рэдка, а то і зусім не арганізоўваліся культпаходы ў кіно, тэатры з іх паследуючым абмеркаваннем. Як сказала ў сваім выступленні дэлегат М. Марчанка, камітэт мала цікавіўся агітацыйна-масавай работай у калгасах падшэфнага Дзяржынскага раёна. Чыталіся, напрыклад, даклады на антырэлігійныя тэмы. Правільныя, актуальныя тэмы. Але дрэнна тое, што камітэт не змог арганізаваць гэтай работы так, каб праводзімыя даклады і гутаркі маглі поўнасцю задаволіць калгаснікаў. Справа ў тым, што адны і тыя-ж даклады чыталіся на працягу некалькіх год. І таму невыпадкова адзін з калгаснікаў, праслухаўшы даклад, устаў і развёў рукамі.

— Прабачце, гэты-ж даклад я слухаў і летась і пазалетась.

Непрыемна было дакладчыку і за сябе і за свой універсітэт. Альбо, бывала, прыедзе дакладчык у МТС і ўгаварвае інжынераў, тэхнікаў, аграномаў—людзей, якія з'яўляюцца членамі партыі,—«Не веруйце ў бога».

Дэлегат тав. Васілеўскі крытыкаваў камітэт за дрэнную арганізацыю падпіскі на газеты і іх дастаўку. Некаторыя студэнты атрымоўваюць адну газету за два-тры тыдні, а то і зусім не бачаць іх ў вочы. Няма на руках квіткоў, з якімі можна-б было звярнуцца ў гарадское аддзяленне Саюздруку. А праводзіўшая падпіску тав. Багданава і сама не ведае, куды падзеліся гэтыя квіткі.

У спрэчках па дакладу выступілі дэлегаты Харлан, Бабосаў, Маркаў, Берлін і другія, якія адзначылі, што камітэт комсамола працаваў вяла, без аганьку, рабіў частыя промахі ў рабоце.

В. ХОРСУН.

# ЗРАБІЦЬ КОМСАМОЛЬСКУЮ РАБОТУ ЦІКАВАЙ І ЗМЯСТОЎНАЙ!

★ ★ ★

## У АДРЫВЕ АД АКТЫВУ

Комсамольцы, якія прышлі апошнімі на сход, з цяжкасцю знаходзілі месца. Адсутных было ўсяго некалькі чалавек. І гэта зразумела: бюро ЛКСМБ біёлага-глебавага факультэта трымае справаздачу за год сваёй работы.

Член бюро факультэта Н. Лаўрова [illegible]ала справаздачу прыкладна так:

— Задача комсамольскай арганізацыі—дапамагчы дэканату і партыйнай арганізацыі факультэта ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных і ідэйна ўзброеных спецыялістаў.

Гэта правільна. Ніхто з прысутных і не думаў пярэчыць супроць такой ісціны.

Але па меры таго, як дакладчыца пачынае гаварыць аб канкрэтных справах, у зале часта паяўляецца ажыўленне. Усё новыя і новыя комсамольцы запісваюцца для ўдзелу ў спрэчках. Аказваецца, што бюро факультэта не заўсёды ставіла ў цэнтр увагі жывых людзей, комсамольцаў, мала клапацілася аб іх [illegible]быце і выхаванні. Бюро мала пр[illegible]уляла творчай ініцыятывы, не раз ужывала канцылярскія метады кіраўніцтва.

— Чаму ў нас арганізацыйная работа была наладжана слаба? А таму, што бюро не было звязана з комсамольскімі групамі,—гаворыць выступаючая ў спрэчках Шырко,—таму што члены бюро адарваліся ад сваіх комсамольцаў.

— Чаму ў баку ад грамадскай работы засталіся леташнія першакурснікі?—законна пытаецца студэнтка Сусеева. І сама адказвае:

— А гэта здарылася па віне бюро, таму што за цэлы год ніхто з яго членаў не пацікавіўся жыццём першакурснікаў, не зайшоў на гэты курс. Вось чаму,—сказала яна,—работа групоргаў І і ІІ курсаў была ацэнена нездавальняюча.

І на другіх курсах справа была не на многа лепшай. Большасць комсамольцаў не мела ніякіх даручэнняў. Указанні групоргам члены бюро давалі звычайна на хаду, у часе перапынкаў паміж лекцыямі. Ясна, што пры такіх абставінах не можа быць ніякіх размоў аб арганізацыйнай рабоце бюро біёлага-глебавага факультэта. Аб рабоце групавых арганізацый члены бюро судзілі фармальна, па колькасці сходаў. А на самай справе на гэтых сходах многія пытанні вырашаліся павярхоўна, на скорую руку, абы як.

Мастацкая самадзейнасць—гэта адзін са сродкаў комуністычнага выхавання моладзі. Яна дапамагае фармаванню культурнага аблічча чалавека, развівае мастацкі густ і ўзбагачае духоўны свет маладых людзей. Удзел у мастацкай самадзейнасці, вечарах адпачынку запаўняе глыбокім зместам вольны час моладзі. Але бюро не ўлічыла гэтых запатрабаванняў. На факультэце культурна-масавая работа была арганізавана дрэнна.

— Сумна ішло жыццё у нас,—гаварыла Алехновіч.—Не было дыспутаў, літаратурных, або тэматычных вечароў. Мы хацелі арганізаваць на курсе драматычны і харавы калектывы. Але бюро адмовілася дапамагчы нам, і гэтыя гурткі арганізаваны не былі.

Выступаўшыя гаварылі аб тым, што на факультэце не было ні аднаго вечару адпачынку. Самацёкам ішла таксама і шэфская работа. Бюро не наладжвала ні кантроля, ні дапамогі агітатарам. Таму не дзіўна, што з 20 агітатараў, прымацаваных да Аўтарамбуда, у лепшым выпадку працавала 10.

З боку бюро не было дастатковага кантролю за выкананнем даручэнняў. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца той факт, што з 60 даручэнняў, якія былі дадзены на час зімовых канікул, былі выкананы адзінкі. Бюро вельмі мала займалася пытаннямі асабістай культуры студэнта, пытаннямі норм паводзін у грамадскім месцах. Не дзіўна, што сярод студэнтаў факультэта былі амаральныя ўчынкі. Студэнт ІІІ курса глебавага аддзялення Кажура груба адносіцца да дзяўчат. Комсамольская арганізацыя праходзіла міма гэтага факта. Студэнты-комсамольцы Галадушка, Савіцкі і Самусенка ў час спаборніцтваў па валейболу на гульню прышлі п'янымі.

Гэта выклікала абурэнне ўсёй каманды, але не членаў комсамольскага бюро. А калі ў наступны раз гэтых таварышаў упрашвалі прыйсці на гульню, Савіцкі груба адказаў:

— Здароўя няма!..

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што ў рабоце комсамольскай арганізацыі факультэта не было зладжанасці, шырокія комсамольскія масы ў рабоце не ўдзельнічалі. Бюро факультэта мала змагалася за высокія маральныя якасці студэнтаў. Яно было адарвана ад групавых комсамольскіх арганізацый.

Выступаўшыя, апрача справядлівай крытыкі, гаварылі аб сваіх патрабаваннях і жаданнях, указвалі, як у хуткім часе выправіць усе недахопы і зрабіць комсамольскую работу цікавай і змястоўнай.

**Г. ЗОТАЎ.**

★ ★

## Глыбей адлюстроўваць комсамольскае жыццё

Днямі на факультэтах і курсах адбыліся справаздачна-выбарчыя комсамольскія сходы. Студэнты абмяркоўвалі работу сваіх комсамольскіх бюро. Сходы падвялі вынікі работы груп, ускрылі недахопы і выбралі новыя бюро.

Газета «Слова філолага» ў другім нумары піша:

> «Сход пачаўся бурна, з шумам і выкрыкамі з месц. Справаздачны даклад сакратара т. Каленчыца асвяціў усё станоўчае і ўскрыў адмоўныя бакі работы курса. Аднак у сваёй аснове даклад быў бессістэмны, пераважалі асобныя факты і прозвішчы студэнтаў, а глыбокага аналізу работы не было».

Газета правільна адзначае, што комсамольскае бюро ІІІ курса аддзялення журналістыкі ліберальнічала, не прымала мер да парушальнікаў вучобы, хавала ад дэканата факты ненаведвання асобнымі студэнтамі лекцый.

Пад агульным загалоўкам «Адказны момант у комсамольскім жыцці» газета ўмела аналізуе комсамольскія сходы ІІ і ІІІ курсаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

Правільна пастаўлена тут і пытанне аб комсамольскіх даручэннях як важнейшым метадзе ўцягнення комсамольцаў у грамадскую работу універсітэта.

І, наогул, комсамольскае жыццё стаіць у цэнтры ўвагі насценнай газеты «Слова філолага».

Зусім інакш адносіцца да гэтага пытання насценная газета «Совецкі хімік» (нумар, на жаль, адсутнічае). Яна амаль упусціла з поля зроку такі важны момант у комсамольскім жыцці, як справаздачна-выбарчыя сходы. Заметка ў дзесяць радкоў «Коратка» расказвае, што на ўсіх курсах прайшлі такія сходы і паведамляе, хто выбран у склад комсамольскага бюро. Як-жа прайшлі сходы, на якім ідэйным узроўні—адказу газета не дае, хаця прайшлі яны не зусім здавальняюча. Гэта відаць з вершаванай замалёўкі аднаго сходу, дзе з сарака зарыфмаваных радкоў ясна толькі тое, што студэнты не жадалі выступаць.

Праўда, у газеце ёсць змястоўны матэрыял сакратара комсамольскага бюро т. М. Марчанка, дзе падымаюцца некаторыя пытанні работы на курсе. Напрыклад, газета піша, што комсамольскае бюро павінна ўдзяляць больш увагі экскурсіям і культпаходам, арганізоўваць добрыя вечары адпачынку, каб гэтым самым яшчэ больш згуртаваць групу, зацікавіць яе масавай работай.

У бюлетэні справаздачна-выбарчага комсамольскага сходу хімічнага факультэта многа гаворыцца пра асобных студэнтаў, якія прапускалі заняткі або адмаўляліся ўдзельнічаць у мастацкай самадзейнасці. Але на сходзе гутарка ішла галоўным чынам аб рабоце комсамольскага бюро. Дзе работа бюро? У бюлетэні няма адказа на гэтае пытанне.

Амаль такі-ж па зместу і бюлетэнь справаздачна-выбарчага сходу геолага-геаграфічнага факультэта. Аб рабоце комсамольскага бюро тут не сказана амаль ні слова, затое крос займае тут пачэснае месца. Рэдакцыя паступіла не зусім правільна, прысвяціўшы бюлетэнь кросу, а не рабоце бюро.

Глыбей адлюстроўваць работу комсамольскіх бюро з групамі, падымаць надзённыя пытанні комсамольскага жыцця, указваць на недахопы ў рабоце групы—адна з важных задач насценнага друку.

## Па-сапраўднаму цікавіцца вучобай

Аддзяленне фізікі па паспяховасці займае адно з апошніх месцаў ва універсітэце. Амаль у кожнай групе ёсць па некалькі непаспяваючых студэнтаў, якія сістэматычна праваьваюць экзаменацыйныя сесіі. За апошні час на аддзяленні рэзка знізіўся лік выдатнікаў. Многія студэнты не ліквідавалі яшчэ акадэмічнай запазычанасці.

Прычыну нізкай паспяховасці на аддзяленні трэба шукаць у тым, што комсамольскае бюро (адказны за акадэмічны сектар т. Ткачоў) не цікавілася пытаннямі вучобы студэнтаў, не ведала становішча ў групах. Як адзначалі выступаўшыя ў спрэчках комсамольцы Валковіч і Бічанкоў, за год на некаторых курсах ні разу не праводзіліся групавыя сходы, на якіх абмяркоўваліся-б пытанні вучобы. Толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што на трэцім курсе комсамольцы зусім не цікавяцца вучобай сваіх аднакурснікаў. Не дапамагла група студэнтам Лойка, Маргуну, Раманенка, якія былі выключаны з універсітэта за непаспяховасць. Група прадаставіла самаму сабе былога франтавіка Захарэвіча, які з-за вялікага перапынку ў вучобе не змог здаць сесію без троек.

Дэкан фізіка-матэматычнага факультэта Халімановіч, які выступіў на сходзе з цікавай прамовай, адзначыў, што комсамольскае бюро не займалася пытаннямі дысцыпліны. Студэнты аддзялення па данных старастаў за год прапусцілі без уважлівых прычын 688 гадзін. Фактычная-ж лічба значна вышэй. А без наведвання лекцый на аддзяленні фізікі вучыцца немагчыма.

Адказны за акадэмічны сектар Ткачоў ніколі не пацікавіўся, як студэнты арганізоўваюць самастойную работу. А многія комсамольцы нерэгулярна займаюцца ў семестры і, калі наступае сесія, спрабуюць «штурмам» здаць такія працаёмкія курсы як квантавая механіка і метады матэматычнай фізікі. Не дзіўна, што яны атрымоўваюць дрэнныя адзнакі.

Паглыбіць веды студэнтаў, навучыць іх сістэматычна працаваць заклікана таксама студэнцкае навуковае таварыства. Але комсамольскае бюро па-сапраўднаму не дапамагала яму.

На сходзе было кінута многа папрокаў і ў адрас выкладчыкаў. Многія з іх абмяжоўваюцца чытаннем лекцый і не вядуць ніякай выхаваўчай работы ў групах. Як адзначыла студэнтка ІІІ курса Жэнеўская, выкладчык марксізма-ленінізма тав. Маханёк чытае лекцыі сухой мовай, дазваляе студэнтам займацца на лекцыях, хто чым жадае.

Новаму складу бюро аддзялення фізікі трэба па-сапраўднаму зацікавіцца пытаннямі вучобы.

**А. ЯСКЕВІЧ.**

## Універсітэцкі вожык

### на комсамольскай канферэнцыі






*Стварылі планаў столькі,*
*Што асудзіць не смеў ніхто,*
*Ды часу не хапала толькі*
*Усё праводзіць у жыццё.*



Комсамольская арганізацыя пытанні быта студэнтаў лічыць манаполіяй профсаюзаў. Можа пагэтаму студэнтам, якія жывуць у корпусе «Б», прыходзіцца выносіць смецце ў кішэнях, бо ні на калідорах, ні ў пакоях няма ўрнаў для смецця.

